ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
2024 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю бардаўскай песні
памяці Ул. Высоцкага "Музыка сэрцаў"

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю-конкурсу бардаўскай песні памяці Ул. Высоцкага "Музыка сэрцаў" (далей – Фестываль).

2. Мэтамі і задачамі Фестывалю з'яўляюцца: захаванне і развіццё лепшых традыцый жанру бардаўскай песні; пошук і выяўленне новых творчых талентаў у жанры бардаўскай песні; аб'яднанне выканаўцаў і прыхільнікаў бардаўскай музыкі; стымуляванне развіцця творчых здольнасцяў удзельнікаў; фарміраванне культуры адпачынку; далучэнне грамадскасці да традыцый бардаўскай музыкі.

3. Арганізатарамі Фестывалю з'яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, дзяржаўная ўстанова культуры "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", аддзел культуры Навагрудскага раённага выканаўчага камітэта.

4. Пры арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенні Фестывалю арганізатары і ўдзельнікі кіруюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўднай Інструкцыяй.

5. Агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Фестывалю ажыццяўляецца арганізацыйным камітэтам (далей – аргкамітэт) склад якого зацвярджаецца дадаткова (дадатак 1).

6. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама аб пераносе даты правядзення Фестывалю (у іншыя тэрміны).

7. Фестываль праводзіцца кожны год.

8. Фестываль адбудзецца 27-28 ліпеня 2024 года на тэрыторыі возера Літоўка Навагрудскага раёна, або ў выпадку дрэннага надвор'я ў глядзельнай зале дзяржаўнай установы культуры "Навагрудскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці".

9. У Фестывалі прымаюць удзел выканаўцы твораў Ул. Высоцкага, аўтары-выканаўцы, творчыя калектывы з ўсіх рэгіёнаў вобласці, асноўным

напрамкам дзейнасці якіх з'яўляецца захаванне і падтрымка традыцый бардаўскай музыкі і творчасці Ул. Высоцкага ва ўзросце ад 16 гадоў.

10. У праграму выступлення ўдзельнікаў Фестывалю ўключаюцца 2 вакальныя творы (адзін з якіх абавязкова – твор Ул. Высоцкага, другі – аўтарскі або бардаўскі), якія павінны быць выкананы пад "жывы" акампанемент, пры неабходнасці, з выкарыстаннем фанаграмы "-1".

11. Па выніках Фестывалю журы (дадатак 2) вызначае і ўзнагароджвае дыпломамі лаўрэата (I, II, III ступені) у рамках, уручае грашовыя прэміі і памятныя сувеніры ў наступных намінацыях:

"выканаўца аўтарскага твора" (аўтар слоў і музыкі);

"аўтар слоў выконваемага твора";

"аўтар музыкі выконваемага твора";

"выканаўца твора Ул. Высоцкага";

"аўтарскі калектыў";

"выканаўца бардаўскай песні".

12. Дадаткова журы ўзнагароджвае ўдзельнікаў:

дыпломам "глядацкіх сімпатый" у рамцы, грашовай прэміяй і памятным сувенірам;

дыпломам "за адданасць фестывалю" у рамцы, грашовай прэміяй і памятным сувенірам.

13. Астатнія ўдзельнікі Фестывалю атрымліваюць дыплом за ўдзел у фестывалі, памятны сувенір.

14. Журы мае права не прысвойваць месцы, падзяляць II, III месцы, аб'ядноўваць, змяняць ці ўводзіць дадатковыя намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду, вызначаць дадатковыя спецыяльныя прызы, не прысуджаць званні лаўрэатаў.

15. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

16. Пры падвядзенні вынікаў журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі: ідэйна-мастацкі ўзровень конкурснага твора; выканальніцкае майстэрства; сцэнічная культура; арыгінальнасць і навізна ў падачы матэрыялу; артыстызм.

17. Для ўдзелу ў Фестывалі да 21 ліпеня 2024 года накіроўваюцца заяўкі (дадатак 3) на электронны адрас дзяржаўнай установы культуры "Навагрудскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" novogrudokrmc@mail.ru, тэлефон 8(01597) 60250, 60200, +375292830886 (МТС).

18. Фінансаванне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў раённага бюджэту, прадугледжаных у каштарысе аддзела культуры Навагрудскага раённага выканаўчага камітэта на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

19. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуецца: набыццё сувеніраў, выраб дыпломаў, рамак для дыпломаў, грашовыя прэміі пераможцам Фестывалю.

20. Для фінансавання Фестывалю на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

21. Накіраванне заяўкі і ўдзел у Фестывалі азначае поўнае і безумоўнае прыняцце правілаў дадзенай Інструкцыі.

22. Транспартныя і камандзіровачныя выдаткі ўдзельнікаў да месца правядзення Фестывалю ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючай арганізацыі.

23. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс выступленняў выканаўцаў і яго распаўсюджванне рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю бардаўскай песні памяці Ул. Высоцкага "Музыка сэрцаў"

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога фестывалю бардаўскай песні памяці
Ул.Высоцкага "Музыка сэрцаў"

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня аргкамітэта*; |
| Грыц А.М. | намеснік старшыні Навагрудскага райвыканкама, *старшыня аргкамітэта*; |
| Шабановіч М.К. | начальнік аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама, *намеснік старшыні аргкамітэта*; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара дзяржаўнай установы культуры "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Цішчанкаў А.І. | дырэктар дзяржаўнай установы культуры "Навагрудскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" |

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю бардаўскай песні памяці Ул. Высоцкага "Музыка сэрцаў"

СКЛАД ЖУРЫ
абласнога фестывалю бардаўскай песні памяці
Ул.Высоцкага "Музыка сэрцаў"

| | |
|---|---|
| Монін Ю.У. | лаўрэат міжнародных конкурсаў і фестываляў, аўтар і выканаўца , *старшыня журы* |
| Грыц А.М. | намеснік старшыні Навагрудскага райвыканкама, *сустаршыня журы*; |
| Шабановіч М. К. | начальнік аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама, *намеснік старшыні журы*; |
| Галянеўская Ю.А. | загадчык аддзела метадычнай работы дзяржаўнай установы культуры "Навагрудскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных установ упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара дзяржаўнай установы культуры "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Сідаркевіч Н.В. | намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце ДУА "Навагрудская дзіцячая школа мастацтваў" |

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю бардаўскай песні памяці Ул. Высоцкага "Музыка сэрцаў"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік (загадчык) аддзела (сектара) культуры гар(рай)выканкама

Заяўка
на ўдзел у абласным фестывалі бардаўскай песні памяці
Ул. Высоцкага "Музыка сэрцаў"

1. Раён ____________________
2. Намінацыя ____________________
3. Імя, прозвішча, імя па бацьку ўдзельніка ____________________
4. Дата, год нараджэння ____________________
5. База дзейнасці ____________________
6. Месца працы, вучобы ўдзельніка ____________________
7. Пашпартныя дадзеныя (нумар, калі і кім выдадзены) ____________________
____________________
8. Назвы конкурсных нумароў (аўтары музыкі і слоў) ____________________
____________________
9. Кантактны тэлефон і e-mail ____________________
10. Неабходнае абсталяванне і тэхнічнае забеспячэнне ____________________
____________________
11.Колькасць чалавек удзельнікаў ____________________
12. Кароткая творчая характарыстыка ____________________
____________________
____________________
____________________
____________________

13. З умовамі інструкцыі аб арганізацыі і правядзенні фестывалю згодны. Прэтэнзій не маю.
14. Згода на апрацоўку персанальных дадзеных.

Кіраўнік установы ____________________
(подпіс)

Заяўкі на ўдзел у абласным фестывалі бардаўскай песні памяці Ул. Высоцкага павінны выслаць не пазней 21 ліпеня 2023 г. на адрас: 231400 г. Навагрудак, пл. Леніна, 7, эл.пошта: novogrudokrmc@mail.grodno.by. Кантактная інфармацыя: дырэктар 8(01597)60250, аддзел метадычнай работы 8(01597)60200.